© ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
ISSN 1819-3625 № 1 (2001)


# Косава: прастора выбараў

***Андрэй Казакевіч***

Цікавасць да палітычнага і сацыяльнага развіцця Косава, часткі Югаславіі, якая з 1999 г. знаходзіцца пад знешнім кіраваннем ААН, з насельніцтвам не больш за 2–2,5 мільёна чалавек, мае некалькі прычынаў:

Па-першае. Косава з'ўляецца добрым прыкладам постканфліктнага грамадства, грамадства "пасля вайны", з неакрэсленай палітычный будуцыняй, але досьведам адктытага палітычнага гвалту і збройнага супраціўлення. Агульна прызнанай з'ўляецца эмпірычныя вартасць праторы сацыяльнага канфлікту для паліталагічных даследванняў, крызіс здольны выявіць шматлікія сацыяльныя з'явы, якія не аналізуюцца ў стабільных грамадствах. Даследванне паводзінаў грамадства ў крызісных сітуацыях дапамагае і агульнатэарытычнаму разуменню соцыума. Такім чынам Косава прадстаўляецца не дрэнным аб'ектам даследвання, як комплексная тэрыторыя-соцыум, так і як асобныя супольнасці: албаныцы, сэрбы, баснійцы.

Па-другое, што падаецца самым галоўным. Косава з'яўляецца адзіным прыкладам прамога знешняга кіравання ў Эўропе. Гэта дае магчымасць вывучаць тэорыю і практыка кіравання міжнародных структураў, іх стыль паводзітнаў, "рэфлексы", стэратыпы і парадыгмы. Фактычна кіраванне у Косава ажыцяўляе сапраўднае "глабалiская" ,структура і па форме і па змесце. Мы маем справу з шматнацыянальным, апаратам, які створаны на аснове міжнародных дамоваў і ажыцяўляе поўнае эканамічнае іпалітычнае кіраванне. Гэты аппарат мае спецыфічную структуру, ідэялогію, практыку і значна адрозніваюцца ад нацыянальных інстытуцыяў.

Па-трэцяе. Сытуцыя у Косава непасрэдна звязана з пытаннем стабільнасці на Балканах, будучыні і цэласнасць рэгіёну, перспектывай эўрапейскай інтэграцыі. Косава ёсць аб'ектам для славянскіх даследванняў. Развіццё "Албанскага пытання" на сучасным этапе, гэта пераважна славянска-албанскія дзяржаўныя і этнічныя дачыненні. Акрамя таго, Косава з'яўляецца пераважна мусульмаскім краем з моцнай еўрапеізаванай і ветрэрнізаванай свядомасцю. Свайго роду ідэяльным тыпам "цывілізацыйнага пранікнення" ці "цывілізацыйнага сутыкнення", дзе эўрапейская цывілізацыя (у форме "нацыяналізму") дамінуе над рэлігійнай свядомасцю. Развіццё сэкулярызаванага грамадства ў Косава выяўляе працэсы характэрныя для іншых мусульманскіх краінаў, якія знаходзяцца ў арбіце эўрапейскага культурнага ўплыву і перш заўсё Турцыі і постсаветскіх краінаў Каўказу і Сярэдняе Азіі. Ткім чынам пяройдзем непасрэдна да аналізу выбараў у Асамблею Косава.

## Палітычная і прававая аснова

Пасля палітычнага і вайсковага крызісу 1999г., у адпавекднасці з рэзалюцыі №1244 Савета Бяспекі ААН, Косава і Метохія знаходзіцца пад знешнім кіраваннем Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў (ААН). Ад пачатку Косава было падзедена на 5-ць зонаў адказнасці: ЗША, Германіі, Злучанага Каралеўства, Францыі і Італіі, вайсковы адзінкі якіх складаюць разам з прадстаўнікамі іншых дзяржаў свету збройныя сілы для падтрымання міру – KFOR.

Інстытуцыяй, якая ажыцяўляе кіраванне краем з'яўляецца Місія ААН у Косава (UNMiK, United Nations Mission in Kosovo). Гэта ёсць паўнавартая бюракратычная стрктура, якая была створана ў адпаседнасці з Рэзалюцыяй Савеьа бяспекі ААН № 1244 ад 10.06.1999 г. UNMiK павінен ажыцяўляць пераходнае адміністратыўнае кіраванне да стварэння часовых дэмакратычных інстытуцыяў самакіравання, для гарантыі міру і нармальнага жыцця насельніцтва Косава.

Місія ААН у Косава складаецца з некалькі аўтаномных і розных па паходжанню частак:

1. Паліцыя і правасудзе. Ажыцяўляецца ААН-аўскімі структурамі. Асноўныя паліцэйскія функцыі ажыцяўляе UN Civil Police (CivPol) – Цывільная паліцыя ААН, якая ажыцяўляе кантроль над мясцовымі паліцэйскімі сіламі – Паліцэйскай службай Косава.
2. Цывільная адміністрацыя – структуры ААН. Пастyпова адбываецца замяшчэнне функцыяў цывільнае адміністрацыі ААН мясцовымі структурамі, у тым ліку і шляхам выбараў.
3. Дэмакратыя і стварэнне інстытутаў – АБСЕ (OSCE Mission in Kosovo) і яе структурныя адзелы.
4. Рэканструкцыя і эканамічнае развіццё – структуры Эўрапейскага Зьвязу і ААН. У якасці грашовае адзінкі выкарыстоўваюцца Нямецкая марка, югаслаўская валюта выведена з абарачэння.

Такім чынам арганізацыя (organisation), правядзенне і нагляданне (supervision) за выбарамі з'яўляецца функцыяй Місіі АБСЕ у Косава. Першы досьвед у гэтай галіне быў атрыманы ў мінулым годзе, калі былі праведзены муніцыпальныя выбары.

Выбары ў Асамблею Косава былі абвешчаны ў адпаведнасці з прынятай «Рамачнай канстытуцыяй для часовых арганаў мясцовага самакіравання» (The Constitutional Framework for Provisional Self-Gavenment). Гэты дакумент вызначае асновы выбарчае і судовай сістэмы, функацыі і паўнамоцтвы Асамблеі, Прэзідэнта, Ураду Косава. У апаведнасці з Рамачнай Канстытуцыяй усталёўваецца рэжым парламескага тыпу, Асамблея абірае Прэзідэнта і уплывае на фарміраванне Ураду, такім чынам выбары ў парламент фактычна цалкам фарміруюць новую часовую уладу ў краі. Тэрмін паўнамоцтваў Асамблеі – тры гады. Паўнамоцтвы не прадугледжваюць магчымасць прыняцця акту пра Незалежнасці ці іншый дэкляцыяў, якія тычацца статусу Косава.

## Адміністратыўная інфраструктура выбараў

Агульную кантроль і арганізацыю выбараў у Асамблею ажыцяўляў Дэпартамент АБСЕ па выбарам, які з'яўляецца часткаю штату міссіі АБСЕ у Косава. Дэпартамент дзейніцае на аснове 5-ці рэгіянальных і 21 «палявых» (Field) офісаў. Гэтыя структуры таксама забяспечвалі тэхнічную арганізацыю выбараў (транспарт і размеркаванне матырыялаў ад выбарчых белютэняў да ліхтарыкаў).

Цэнтральная выбарчая камісія (CEC). Складаецца з трох міжнародных і 9-ці мясцовых сябраў з тэрмінам паўнамоцтваў два гады. Яе функцыі падобны да функцыяў любое цэнтральнае камісіі, уключаюцы права на выданне нарматыўных актаў (Electoral Rules), агульнае наглядання за выбарчым прачэсам. Пры ЦВК створана субкамісія па скаргам і апеляцыям (1 міжнародны і тры косаўскія сябры) якая адказная за разгляд скаргаў на парушэнне выбарчага заканадаўства. Юрыдычнае забеспячэнне выбараў складаецца з: актаў UNMiK, Рамачнай Канстытуцыі, пастановаў ЦВК (Electoral Rules) было выдадзена каля 13, Адміністратыўнай працэдуры. Адміністратыўная працэдура (Administrative Procedures) – зборнік вытрымак розный нарматыўных актаў, які суправаджаецца тлумачэннмі, ілюстрацыямі і прыкладамі. Адміністратыўная працэдура была дакументам на якім асноўвалась праца і навучанне сябраў камісіяў і міжнародных супервайзераў.

ЦВК прызначае сябраў муніцыпальных выбарчых камісіяў (ад 3 да 7 сябраў, у залежнасці ад рэгіену). Муніцыпальныя камісіі фармірують і ажыцяўляюць тэнінг і навучанне сябраў участковых (Polling Station) камісіяў. У адпаведнасці з патрабаваннямі, якія былі прыняты ЦВК, участковыя камісія былі фарміраваны на парытэтнай аснове. На 60% з сябраў партыяў, якія атрымалі месцы ў выніку муніцыпальных выбараў 2000г., 20% з іншых партыяў і 20% з NGO.

Нагляданне (Supervision). Нагляданне з'яшляецца інстытутам міжнароднага кантролю за выбарчым працэсам. Сутнасць наглядання ў наяўнасці ў складзе кожнай участковай камісіі міжнароднага супервайзэра (International Polling Station Supervisor, IPSS). IPSS мае спецыяльныя паўнамоцтвы: ажыцяўляе агульны нагляд за выкананнем патрабаванняў выбарчага заканадаўства, мае права спыняць парушэнні; адмяніць рашэнне старшыні камісіі; адказвае за справядлівасць выбарчага працэсу; за захаванне і транспар белютэняў, печаткі, спісу выбаршчыкаў; падпісвае форму з вынікамі галасавання. Калі сябры камісіі не дастаткова дасведчаны ў выбарчых працэдурах, што здараецца вельмі часта, IPSS ажыцяўляе непасрэднае кіраванне выбарчым працэсам. Па аб'ему паўнамоцтваў і адказнасці статус IPSS веравычае статус старшыні участковай камісіі. Агульная колькасць супервайзэрай была каля 2000 чалавек (разам з рэзэрвам). Штат IPSS быў запрошаны АБСЕ праз дзяржаўныя структуры і шырокую сетку арганізацыяў, якія тым ці іншым чынам займаюцца арганізацыяй, нагляданнем, альбо назіраннем за выбарамі. Дэлегацыя ад Беларусі склала 7 чалавек.

Галасаванне праходзіла як на участках на тэрыторыі Косава, так і па-за яго межамі, перш за ўсё ў Сэрбіі і Чарнагорыі, дзе занаходзяцца асяродкі бежанцаў, на так званых out-of-Kosovo (OOK) участках. Для тых, хто знаходзіўся ў замежжы была магчымасць галасаваць па пошце. Спісы выбаршчыкаў былі складзены на аснове спісаў цывільнае рэгістарцыі, акрамя прозвішча і імя, яны утрымлівалі: нумар цывільнае рэгістрацыі і фотаздымак. Калі выбарсчык адсутнічаў у спісе, але меў дакумент з фотаздымкам, ён меў права галасаваць дадатковым белютэням, які меў асаблівы парадак праверкі і падліку. Для прадухілення падвойнага галасавання, кожнаму выбаршчыку пры атрыманні белютэня на руку наносілась сумясь, наяўнасць якой правяралася пры ўваходзе на ўчастак ультрафіялетавай лямпай.

Арганізацыя выбараў мела некалькі асаблівасцяў, якія звязавны з *межэтнічнай сітуацыяй у Косава.* Напрыклад назвы партый у выбарчым белютэне падавалісь на мове іх этнічнага грунту – албанскай моваю пазначаліся албанскія партыі, сэрбскай[1] сэрбскае кааліцыі, турэчкай турэчкія і г.д. Лісты, якія паказвалі выбаршчыкам як галасаваць былі адначасова на албанскай, сэрбскай, баснійскай і турэчкай мове.

У міжнародный структураў існуе нават свайго роду слоўнік «палітычнае карэктнасці», які рэкамендуе ужываць адны тэрміны ў ацэнкі сацыльна-палітычнае сітуацыі і не ўжываць іншых. Напрыклад, слова начыянальная меншасць лепей замяняць словам – супольнасці; канфлікт, вайна – крызіс; касавары – карэнныя жыхары Косава; міжнародная – знешнія (external) стасункі г.д. Назвы населеных пунктаў падаюцца падвоена, першай ідзе албанская назва, калі албанцы складаюць большасць, затым сэрбская і наадварот, сэрбская потым албанская, калі большасць складаюць сэрбы. Палітычная карэктнасць, гэта свайго роду тэхналегія «post-crisis menengment» міжнародных структураў на Балканах.

## Выбарчая сістэма. Практыка этнічнага падзелу улады

Выбарчая сістэма Косава прапарцыянальнае, але працэдцра фарміравання Ассамблеі мае некалькі асаблівасцяў, якія звязаны са складанай этнічнай і палітычнай сітуацыяй у краі пасля вайны. Спецыфіка выбарчае сістэмы заключаецца ў наяўнасці гарантаваных месцаў для нацыянальных меншасцяў агульнай колькасцю 20 са 120.

Такім чынам, Асамблея, як вышэйшая прадстаўнічая і заканадаўчая інстытуцыя самакіравання Косаўскага краю, сладаецца з 120 дэпутатаў. 100 з 120 месцаў у Асамблеі размяркоўваюцца па прапарцыйнай сістэме паміж партыямі, кааліцыямі, грамадскімі ініцыятывамі і незалежнымі кандыдатамі ў залежнасці ад колькасці атрыманых галасоў, адсоткавага бар'еру не існуе (для атрымання аднаго месца ў гэтым годзе было дастаткова 0.5%). 10 месцаў зарезервавана за політіческімі суб'ектамі[2], якія «абвясцілі сябе прадстаўнікамі Сэрбскае супльнасці Косава» (9.1.3(і) Рамачнае Канстытуцыі). Яшчэ 10 месцаў размяркоўваюцца паміж іншымі меншасцямі (альбо, больш палітычнакарэктна – супольнасцямі) Косава. 4 месцы атрымоўвае цыганская супольнасць (цыганне, ашкалі і рома), баснійцы 3 месцы, турэцкая супольнасць 2 месцы і Горані (этнічная група славянаў-мусульман) 1 месца. Калі ад імя аднае супольнасці выступае некалькі палітычных суб'ектаў, то гарантаваныя месцы размяркоўваюцца прапарцыйна колькасці набраных імі галасоў.

Сістэма размеркавання гарантаваных месцаў у якасці асноўнага палітычнага наступства мае тое, што меншасці атрымоўваюць іх не аўтаматычна, але толькі праз удзел у выбарах прынамсі аднае палітычнае партыіі (суб'екту). Прынчып гарантаваных месцаў выкарыстоўваўся

і для вырашэння гендэрнага пытання. У адпаведнасці з пазстановай Цэнтральнай Выбарчай Касіміяй, кожны партыйны спіс партыяў, якія ўдзельнічаюць у выбарах павіннем мець кожным трэццім кандыдатам жначуну. Такі чынам доля жанчын у Асамблеі павінна быць не меней за 1/3. Гэта павінна спрыяць эмансіпацыі, павышэнню сацыяльнае і палітычнае актаўнасці жаночае часткі насельнічтва Косава, а таксама аброне іх эканамічных і культурных правоў. Дарэчы «гендэрныя прапорцыі» тычацца так сама фарміраванне іншых органаў улады і кіравання ў Косава. Напрыклад, срод супрацоўнікаў мясцовае паліцыі некаторых рэгіёнах жанчыны скаладаюць каля 30%, што так сама ёсць вынікам мэтанакіраванае палітыкі.

## Партыйная сістэма[3]

Партыйная сістэма Косава мае адносна стабільную канфігурацыю. Яе асноўныя рысы: Па-першае жорсткі падзел партыяў у залежнасці ад этнічнае базы, межэтнічнага электарту партыі не маюць. Па-другое наяўнасць устойлівае кафігурацыі уплывовых албанскіх партыяў, якая склалася часткова да зброўнага канфлікту 1999г. і канчаткова афолмілмсь пад час муніцыпальных выбараў 2000г. Пачнем з разгляду албанскага спектру, як вырашальнага з палітычнага пункту гледжання.

Сярод албанскіх партыяў вылучаюцца дзве якія валодаюць рэальным палітычным уплывам - LDK, якую узначальвае І. Ругова і PDK на чале з Х. Тачы. LDK (Дэмакратычная ліга Косава) сталая палітычная сіла, якая мае вялікі досьвед палітычнае барацьбы яшчэ да канфлікту паміж Югаславіяй і НАТО. На працягу сваёй дзейнасці партыя арыятавалась на дасягненне незалежнасці Косава негвалтоўнымі метадамі. У пачатку 1998г. калі пачалося адвастрэнне палітычнае сітуацыі ў краі, менавіта І. Ругова перамог на выбарах 22.03.1998г., якія былі арганізаваны насуперак намаганням Белграду і стаў Прэзідэнтам непразнанае «Рэспублікі Косава». Ужо тады Дэмакратычная ліга Косава мела трывалую электаральную базу, афрмленую сістэму мэтаў палітычнае барацьбы, самай галоўнай з якіх была – палітычная незалежнасць Косава, досьвед практычнае палітычнае дзейнасці, папулярнага лідэра. LDK удалося захаваць асноўныя пазіцыі і пасля канфлікту, і перамагчы на мунічыпальнызх выбарах 2000г. у большасці рэгіенах. Агульная колькасць сабраных галасоў была каля 60%. PDK (Дэмакратычная партыя Косава) як сучасны палітычны праект аформілась толькі пасля інтэрвенцыі НАТО. PDK з'яўляецца непасрэдным палітычным спадкаемцам U3K (Ushtria Ѕlirimtare e Kosovës – Армія вызвалення Косава), якая з'ўялалась аснова збройнага руху супрацiву і вяла баі з югаслаўскай арміяй пачынаючы з 1998г., што стала асновай яе папулярнасці і электаральнае базы. Даволі складана вызначыць сутнасную розніцу паміж LDK і PDK, натуральна яна не мае «ідэялагічнага» характару. Непасрэдны досьвед аўтара сведчыць пра тое, што для большасць насельніцтва прынцыповае рознасці не існуе, альбо яна вельмі цяжкая для тлумажэння. Адрозненні перш за ўсё тычацца стылю палітычных паводзінаў, сымболікі, а так сама рознасць у палітычнае практыке на працягу апошніх гадоў. І. Ругова успрымаецца немаладым памяркоўным лідэрам, «інтэлектуалам» старое «дысыдэнска-ліберальнае традыцыі», са стылем паводзінаў, які нагадвае стыль чэскага прэзідэнта Гавэла. Вобраз Х. Тачы зусім іншы. Гэта вобраз маладзейшага, рашучага («радыкальнага») палітыка, з досьведам прамога дзеяння ў канфліктных сітуацыях, традыцыямі U3K. стылева значна больш арыентаванага на моладзь. Папулярнасць партыяў залеўжыць так сама ад рэгіёна. Акрамя таго LDK і PDK маюць фінансавую базу зусім featурознага паходжання. Трэццяй партый, якая мае палітычную вагу з'яўляецца AAK, паходжанне якой з большага выглядае як палітычны праект пэўных бізнэс-колаў. Разумеюцы свой статус паміж двува буйнымі партыямі з трывалымі электаральнымі пазіцыямі, традыцыямі і стылем, AAK выконвае функцыю палітычнае альтэрнатывы. Альтэрнатыва выяўляецца ў прыярытэтных адносінах да эканамічных пытанняў, безпрацоўя, праблемаў модазі, удзелу жанчын у палітыкі і г.д. Канфігурацыя партыйнае сістэмы – Дамінуючая LDK, «моцны канкурэнт» PDK і «альтэрнатыва» AAK была усталявана пад час муніцыпалльных выбараў мінулага году і падцьверджана выбарамі ў Асамблею.

Сярод пераферыйных партыяў ёсць не толькі новыя палітычныя праекты, але і партыі якоя выводзяць сваю гірорыю з 60-х, 80-х гадоў. Маецца набор 4-5 радыкальных нацыяналістычных групаў, група ліберальных, а так сама «ідэялагічных» партыяў па эўрапейскаму узору: партыя зялёных, сацыял-дэмакратычная партыя, хрысуіянска-дэмакратычная, рэспубліканская.

З неалбанскага спектру найбольшым палітычным патэнцыялам вядома валодае сэрбская супольнасць, якая прадстаўлена суполкамі агульнаюгаслаўскіх партыяў, а так сама рознымі косаўскімі арганізацыямі. Удзел у выбарах быў для сэрбаў складаным пытаннем. Частка палітычных сілаў адмовіліс ад разу, як ад кроку да выхаду Косава з Югаславіі. Калі у Белградзе усё ж такі прынялі рашэнне удзельніцаць, сэрбскія арагнізацыі які не прынялі байкот аб'яналісь у адзіную кааліцыю «Повратак», якая аўтаматычна атрымала 10 месцаў у Асамблеі. Наяўнасць агульнасэрбскае салідарнасці фактычна зрабіла Кааліцыю трэццях па значнасці палітычнай сілаў у Косава, але яе адносіны з большасць палітычных сілаў краю зразумела складаныя. Астатнія этнічныя меншасці, таксама маюць свае партыі, але іх самастойная палітычныя пераспектыва забяспечваюцца выключна наяўнасцю зарэзэзваных месцаў у парламенце.

## Ідэялёгія і асноўныя палітычныя мэты

У якасці метадалёгіі аналізу ідэялогіі і асноўных палітычных мэтаў партыяў акрамя традычыйнага падзелу па этнічным групам (албанскія, сэрбскія, астатнія) выкарыстоўваецца падзел ідэйнага поля на Цэнтр і праерфрыю. Такі цэнтр не ме нічога агульнага з цэнтрам у сэнсе «цэнтрыскае пазіцыі», памяркоўнасці і г.д. Цэнтр ёсць дамінуючая, кіруючая ідэялогія, якая лічычча нормай і ўспрымаецца большасцю электарату. Зразумела, што ў канфліктных і нестабільных крамадствах Цэнтр можа быць дастаткова, і нават больш чым радыкальны. Пераферыя, гэта тое, што выпадае, ці выціскаецца з кіруючай ідэлогіі і інсуе трошкі ізалявана. Ткаім чынам пачнем з ідэялогіі і мэтаў албанскіх партыяў.

Першай і асноўнай мэтаю большасці палітычных партыяў Косава выступае будучыня дзяржаўнага статусу Косава і албанцаў, тое ці іншае вырашэнне «албанскага пытання».

Н е з а л е ж н а с ц ь. Можна канстатаваць абсалютнае дамінаванне ідэі стварэння незалежнае дзяржавы сярод албанскіх партыяў Косава. Ідэя неўалежнасці з'яўляецца бяс-

прэчнай і базіснай для палітычнае візіі будучыні краю. Гэта ідэя з'уляецца неад'емнай чаткай ідэялагічнага цэнтру. За незалежнасць выступаюць усе албанскія партыі Косава, акрамя таго катэгарычна за незалежнасць выступаюць дзве буйнейшыя з іх. Гэта не здіўляе бо LDK (І. Ругова) мае вялікі традыцыі барацьбы супраць югаслаўскага суверэнітэту, а PDK (Х. Тачы) у вогуле з'яўляецца непасрэдным палітычным спадкаемцам UЗК таму іх нават гепатытычная лаяльнасць сэрбскаму суверэнітэту выглядае мала верагоднай. Рэзвлюцыя №1244 Савета Бяспекі ААН прадстаўляецца «цэнтрам» як першы крок да рэальнае незалежнасці. Незалежнасць звычайна падаецца, як палітычнакарэктраная ідэя пабудовы шматэтнічнага, талерантнага грамадства з абаронай і нават падтрымкай правоў меншасцяў. Шмаіэтнічнасць павінна стаць першаснай структурай косаўскае дэмакратыі. Дыскурсіўна мадэль «шматэтнічнага Косава» нечым нагадвае ідэі мультыкультуралізму і «паралельнага культурнага існавання» для розных этнічных супольнасцяў у адным грамадстве. Невядома наколькі такая ідэя практычна можа быць рэалізавана, аднак, зразумела, што албанская большасць зойме дамінуючыя уладныя і культурныя пазіцыі.

Другі варыянт вызначэння дзяржаўнага статусу Косава звязаны з праграмаю «Уніфікацыі» албанскага насельніцтва Балканаў. Гэты дыскурс уключае, як ідэю «Вялікае Албаніі» – адзінае унітарнае дзяржавы, так і паступовую дэмакратычную інтэграцыю, албанскага насельніцтва Барканскіх краінаў, без стварэння адзінае дзяржавы (магчыма некалькі дзяржаваў + архіпелаг аўтаноміяў і г.д.). Уніфікацыя ёсць вырашэннем албанскага пытання ў шырокім сэнсе (у вузкім сэнсе – вызначэнне статусу Косава). Ідэя Уніфікацыі складае добрааргнізавану пераферыю палітычных ідэялогій краю. Гэта ідэя незначна артыкулюецца буйнымі партыямі, больш выразны характар яна мае толькі сярод радыкальеных нацыяналістаў LKЗK, LPK, BK ect., якія адкрыта выступалі за канчатковае вырашэнне албанскага пытання на Балканах, лічаць рэзалюцыю №1244 нелегітымнай для албанскага народу і бачаць у ёй мост да аднаўлення сэрбскага суверэнітэту над Косава. Выступаюць за радыкальны і канчатковы разрыў з СРЮ. Застаецца спрэчным пытанне на колькі ідэі «уніфікацыі» і асабліва «Вялікае Албаніі» укарэніны ў свядомасці «рэкспектабельных» палітычных групаў. Зразумела, што адкрытая артыкуляцыя такое ідэі у сучасных умовах можа паставіць крыж, ці прынамсі значна ускладніць палітычную будкчыню любое партыі (палітычнага суб'екту). Імкненне косаўскіх групаў вырашаць палітычныя і вайсковы пытанні па-за Косава супярэчыць інтарэсам міжнародных структураў. Сэрбскі фактар як крыніца нестабіотнасці ў рэгіёне на працягу 90-х гадоў паступова заміняецца албанскім і гэта добра ўсведамляецца большасцью палітычных суб'ектаў. Менавіта таму міжнароднымі структурамі робяцца намаганні для узмацнення укарэненаці албанцаў Косава ў спецыфічную косаўскую ідэнтычнасць і выключна косаўскія праблемы. У гэтых варунках албанскім палітычным сілам прадстаўляецца вельмі немнога месца для палітычных манёўраў у вырашэнні «албанскага пытання у ўырокім сэнсе».

Д э м а к р а т ы я . Падтрымка дэмакратыі і дэмакратычнага праекту развіцця грамадства на аснове эўрапейскіх дэмакратычных каштоўнасцяй так сама з'яўляецца частаю ідлэялягічнага цэнтру і мэтаю (прынамсі дэкляраванай) большасці палітычных суб'ектаў Косава. Эўрапейская дэмакратыя і яе канцэптуальная пазыцыя не аспрэчваецца. Трэба зазначыць, што не аспрэчваецца не толькі сам панятак дэмкратыі, але і прыхільнасць да эўрапейскага разумення гэтага слова, падкрэсліваецца адзінсва з эўрапейска-амерыканскай традыцыяй. Прыхільнае стаўленне да дэмакратыі мае яшчэ і «нацыяналістычнае» значэнне, якое выкрываецца ў пашыранай сярод албанцаў формуле: Democratization promotes the Albanian issue[4]. Формула адэкватная для Косава і ў значнай ступені для Македоніі. Дэмакратызацыя і адсутнасць дэмкрымінацы ў грамадстваe, дзе албанцы складаць пераважную большасць (каля 90% насельніцтва) аўтаматычна недадае ім кантроль над уладаю і вызначаюць культурны характар рэгіёну. Да гэтага трэба дадаць дэмаграфічную сытуацыю: больш высокую нараджвальнасць сярод албанцаў у параўнанні з суеднімі народамі. Нарыклад, захаванне сённяшняе дэмаграфічнае сітуацыі дазволіць албанцам праз 20-30 гадоў стаць большасцю ў Македоніі, што таксама аўтаматычна дасць ім уладу ў краіне пры умове дэмакратызацыі. Дэмакратызацыя не толькі не заміная, але і паскарае працэсы нацыянальнага вызвалення, таму упісванне яе у албанскую ідэнтычнасць падтрымліваецца. Палітычны гвалт у адносінай да меншасцяў у сытуацыі нацыянальнага дамінавання не ме палітычнага сэнсу, таму кацэпт «талерантнасці» таксама цалкам прыймальны.

Э к а н о м і ч н ы л а д , р ы н к а в а я э к н о м і к а . Як і для большасці рэгіёнаў Цэнтральнае і Усходняе Эўропы Косава уласціва безальтэрантыўная арыентацыя на рынкавую эканоміку, прыватную уласнасць, экнамічную інтэграцыю ў эўрапейскія структуры, замежныя інвестыцыі. Гэта пытанне не дыскутуецца. Шмат увагі надаецца рэканструкцыі пасляваеннай экномікі, што робіцца таксама ў межах рынкавае парадыгмы. Адносна спецыфічным з'уляецца адсутнасць больш менш аформленага левага праекту, у выглядзе камуністыснае ці сацыялістычнае партыі (Албанская сацыял-дэмакратычная партыя не можа лічыцца сапраўдным левым праектам). «Дрэннае» стаўленне да левых эканамічных праектаў у значнай ступені тлумачыцца тым, што камунізм і сацыялізм успрымаецца, як пракмет Белграду, часткаю югаслаўскае (сэрбскае) ідэнтычнасці. Выключна «ідэялагічная» ці навад «нацыяналістычная» арыентацыя на рынак, аднак, не значыць рэальнае падрыхтаванасці да рынкавых дачыненняў і наяўнасці рынкавае культуры[5].

Праект з н е ш н е п а л і т ы ч н а й а р ы е н т а ц ы і партыяў таксама кансалідаваны і аднолькавы для большасці палітычных суб'ектаў. Прыярытэтным без сумневу з'яўляецца інтэграцыя і супрацоўніцтва з эўрапейскімі структурамі, перш за ўсё Эўрапейскага Звязу. Не менш значным выступае імкнення да палітычнага і вайсковага супрацоўніцтва, уваходжанне (інтэграцыя) у НАТО[6].

Асобна трэба зазначыць п а л і т ы ч н у ю р о л ю р э л і г і і . Ніводная з партяў, якія удзельнічалі ў выбарах, не выкарытоўвае іслам, «ісламскія каштоўнасці» ці «ісламскія праекты» як частку сваёй палітычнае праграмы. Пра існаванне ісламскага фундаменталізму справа не ідзе. Ісламская ідэнтычнасць і ісламская свядомасць дастаткова слабая і мае значна слабейшыя пазіцыі чым «эўрапейскі» этнічны нацыяналізм[7]. Акрамя такго ў Косава дзейнічае Албанская Хрысціянска-Дэмакратычная партыя ( у выніку выбараў у Ассамблею набрала 0.98%, што дазволеда атрымаць 1 месца ў парламенче, партыя мае таксама некалькі месцаў у органах мясцовага самакіравання пасля муніцыпальных выбараў).

Іерархія палітычных каштоў-

насцяў прыкладна супадае з парадкам у якім яны выкладзены ў артыкуле: незалежнасць і іншя пытанні звязаныя з вырашэннем «албанскага пытання»; дэмакратычны лад, рынкавая эканоміка, празаходняя знешнепалітычная арыентацыя. Пэўныя палітычныя сілы спрабуюць вывесці эканамічныя пытанні на першае месца, але з большага праблемы міжэтнічных і міждзяржаўных адносінаў захоўваюць сваю актуальнасць, таму ставяцца на першы план.

Такім чынам ідэялагічны цэнтр утрымлівае: Незалежнасць Косава ў выглядзе шматэтнічнага і шматкультурнага грамадства з гарантыяй правоў нацыянальным супольнасцям, магчыма з новай ідэнтычнасцю; дэмакратычны лад заходняга тыпу, пашырэнне заходніх палітычных і культурных каштоўнасцяў; рынкавая эканоміка, нават переважна лібелальная рынкавая эканоміка, заходнія тэхналогіі, заходнія інвестыцыі; палітычная, эканамічная інтэграцыя ў эўрапейскія і эўра-атлантычныя структуры – ЭС, НАТО.

Ідэйная аснова палітычных партыяў *нацыянальных меншасцяў*. Пазыцыя ў пытанні палітычнай будучыні Косава сэрбскае супольнасці яскрава выяўляецца назваю адзінае каліцыя, якая удзельнічала ў выбарах - «Повратак» («Вяртанне»). Сэрбы выступаюць за захаванне Косава (выкарыстоўваецца афіцыйная югаслаўская назва краю – «Косава і Метохія») ў складе Сэрбіі і паслядоўнае выкананне Рэзалюцыі №1244 СБ ААН, якая прызнае тэрытарыяльную цэласнасць Югаславіі. За забеспячэнне бяспекі касаўскім сэрбам, вяртанне уцекачоў, спыннне выцяснення неалбанскага насельнічтва з Косава. Па зразумелым прычынам, пытанні эканамічнага развіцця, грамадскага ладу і г.д. не з'яўляюцца для сэрбаў «палітычнымі».

Сярод астатніх этнічных меншасцяў, больш-менш становуча за югаслаўскага суверэнітэту адносятся толькі цыганне (Рома), якія яшчэ да канфлікту 1999г. выступалі як натуральныя саюзнікі сэрбскае супольнасці і Белграду. Актыўна супраць захавання Косава ў складзе Югаславіі выстаюць албанізаваныя цыганне-мусульманаў – ашкалі. Баснійцы і іншыя славянне мусульманне, а таксама туркі не вызначаюцца лаяльнасць да Югасдавіі і больш арыентаваны на незалежнае Косава. У атстніх пытаннях партыі этнічных меншасцяў сканцэнтраваны на вырашэнне праблемаў і адстойванне правоў толькі саёй супольнасці.

## Аналіз вынікаў і электарату

Электарат. Агульная колькасць выбаршчыкаў – аснобаў, якія прайшлі цывільную рэгістрацыю да вызначанага тэрміну і мелі 18 гадоў – склала 1.249.987 чалавек. З улікам тых, хто знаходзіўся па-за Косава. Колькасць выбаршчыкаў, якая прыняла ўдзел у галасаванні – 803.796 чалаек. Яўка склала 64.30%. Гэта даволі нізкі паказчык, асабліва ўлічваючы той факт, што сэрбы далі згоду на ўдзел у галасаванні, што павінна была стаць дадатковы стымулам для актыўнага ўдзелу албанскага насельніцтва. Колькасць сапраўдных белютэняў склала 788.303 (98%) У параўнанні з дадзенымі, якія былі падазены праз некалькі дзен пасля выбараў, колькасць сапраўдных белютэняў узрасла на 8% (64 тысячы). Лічба значная і прычыны не зусім зразумелыя.

Колькасць албанскага электарату склала меней за 85%, што так сама нечакана. Па агульным звесткам доля албанцаў у насельніцтве Косава перавышае 90%, акрамя таго, удзел сэрбаў у галасаванні быў непоўным. Дзякуючы квотам для нацыянальных меншасцяў колькасць албанцаў у Асамблеі склала ўвогуле 70% (85 месцаў). Сэрбскі электарат склаў 11,34% (22 месцы), электарт астатніх меншасцяў адведна 3,9% (13 месцаў). Сярод супольнасцяў якія атрымалі квоты, толькі сэрбы маюць пазітыўны баланс – 12 месцаў атрыманы ў выніку выбараў і 10 па квоце. Увогуле удзел сэрбскае Каліцыі «Повратак» у выбарах можна лічыць даволі ўдалым. Па прагнозам кааліцыя павінна была атрымаць не болей 4–8%. На астатнія меншасці прыпадае толькі 3 месцы атрыманыя ў выніку выбараў супраць 10 па квоце.

Вынікі выбараў не сталі сінсацыяй. Перамогу атрымала LDK 45,65% (47 месцаў), вынік не вельмі удалы, большасць аналітыкаў і журналістаў з кім давялось сустрэцца казалі пра 50%–55% і нават больш значную перамогу. Можна адзначыць пэўнае зніжэнне папулярнасці (альбо ў выніку рэальнага зніжэння, альбо ў выніку змянення яўкі) ў параўнанні з муніцыпальнымі выбарамі 2000 г. PDK 25,70% (26 месцаў) – прыкладна столькі, сколькі чакалася. AAK 7,83% (8 месцаў) – таксама ні дасягненне, ні параза. У вогуле прагнозы, якія агучваліся прадстаўнікамі АБСЕ, на брыфінгах для супервізераў і часткова ў СМІ з большага несправўдзілісь, як у адносінах да яўкі, так і ў адносінах да вынікаў галасавання, што так сама трошкі здзіўляе.

Агульная колькасць галасоў, якія былі пададзены за тры буйныя албанскія партыі і сэрбскую кааліцыю складае 90,52%, калі сюды дадаць электарат меншасцяў, то атрымаецца каля 95%. Такім чынам, толькі 5% галасоў албанскага электарату прыпадае на астатнія палітычныя групы. Увогуле электарльныя базы косаўскіх партыяў вельмі шчыльныя і не дае прасторы для палітычнага манёўру ні буйным, ні дробным партыям. Акрамя таго, ніводная з уплывовых партыяў да гэтага часу не валодала рэальнай палітычнай уладаю, а значыць і не магла зрабіць памылак, каб стварыць передумовы для электарльнае рэвалюцыі.

## Перспектыва

Перамога LDK, дае права І. Ругове заняць пост Прэзідэнта Косава, які абіраецца 2/3 галасоў ад складу Асамблеі. У худкім часе будзе сфарміраваны косаўскі Урад. Худчэй за ўсё новы урад будзе мець каалічыйную аснову, магчыма з удзелам сэрбаў (прынамсі да гэтага імкнецца міжнародныя стуктуры). Тым не менш албанцы маюць у Асамблеі больш за 2/3 галасоў, што цалкам дастаткова для прыняцця любога рашэння. Адразу пасля выбараў І. Ругова падцвердзіў імкненне да незалежнасці Косава, што амаль адразу выклікала негатыўную рэакцыю пэўнай часткі міжнародных структураў. Падаецца, што захаванне статус кво на працягу 3-х гадоў да наступных выбараў, каб азнаёміца з новай палітычнай пазіцыя, усвядоміць свае паўнамоцтвы, правілы ігры і г.д. цалкам задаволіць і новае кіраўніцтва Косава, і міжнародныя структуры. Стратэгія дзеянняў асошніх будзе накіравана на павелічэнне ўплыву неалбанскіх супольнасцяў Косава, каб стварыць прынамсі адносную супраць вагу, падтрымкі памяркоўных партыяў і лідараў (сярод якіх І. Руговане амальшто ідэял), прадухіленне экскалацыі косаўскага пытання і удзелу касавараў у палітычных справах за межамі Косава.

На дадзеным этапе міжанродныя структуры выказваюцца супраць незалежнасці Косава і парушэння тэрытарыяльнай цэласнасці Югаславіі, як гэтая пазіцыя будзе стасавацця з непазбежным імкненнем косаўскае эліты да адлучэння: выявіць час.

## Канчатковыя вынікі выбараў

| Назва палітычных суб'ектаў[8] | Колькасць галасоў | %, (месцаў) |
|---|---|---|
| [9] PGJK – PARTIA Ë TE GJELBERVE E KOSOËS<br>Партыя зялёных Косава | 2 325 | 0,29% (0) |
| LKCK – LËVIZJA KOMBËTARE PËR ЗLIRIMIN E KOSOVËS<br>Нацыянальны рух за вызваленне Косава | 8 725 | 1,11% (1) |
| IRDK – INICIATIVA E RE DEMOKRATIKE E KOSOVËS<br>Новая дэмакратычная ініцыятыва Косава | 3 976 | 0,50% (2) |
| XHEVDET REXHAJ<br>Незалежны кандыдат | 1 330 | 0,17% (0) |
| PDASHK – PARTIA DEMOKRATIKE ASHKALI SHQIPTARE E KOSOVËS<br>Дэмакратычная Ашкалі-албанская партыя Косава | 3 411 | 0,43% (2) |
| LPK – LËVIZJA POPULLORE E KOSOVËS<br>Народны рух косава | 4 404 | 0,56% (1) |
| PSDK – PARTIA SOCIALDEMOKRATE E KOSOVËS<br>Сацыял-дэмакратычная партыя Косава | 1 785 | 0,23% (0) |
| PNDSH – PARTIA NACIONALE DEMOKRATIKE SHQIPTARE<br>Албанская нацыянал-дэмакратычная партыя | 1 066 | 0,14% (0) |
| LATIF KRYEZIU<br>Незалежны кандыдат | 1 199 | 0,15% (0) |
| BK - BALLI KOMBËTAR<br>Нацыянальны фронт | 2 881 | 0,37% (0) |
| PDK – PARTIA DEMOKRATIKE E KOSOVËS<br>Дэмакратычная партыя Косава | 202 622 | 25,70% (26) |
| XUN ЗETTA<br>Незалежны кандыдат | 1 210 | 0,15% (0) |
| КП – КОАЛИЦИЈА ПОВРАТАК<br>Кааліцыя "Вяртанне" | 89 388 | 11,34% (22) |
| LDK – LIDHJA DEMOKRATIE E KOSOVËS<br>Дэмакратычная ліга Косава[10] | 359 851 | 45,65% (47) |
| PREBK – PARTIA ROME E BASHKUAR E KOSOVËS<br>Аб'яднаная Рома (цыганская) партыя Косава | 2 717 | 0,34% (1) |
| IQK – INICIATIVA QYTETARE E KOSOVËS<br>Грамадская ініцыятыва Косава | 631 | 0,08% (0) |
| PQLK – PARTIA QENDRA LIBERALE E KOSOVËS<br>Цэнтрыская лібелальная партыя Косава | 2 403 | 0,30% (0) |
| PLSH – PARTIA LIBERALE SHQIPTARE<br>Албанская ліберальная партыя | 428 | 0,05% (0) |
| PD - PARTIA E DREJTËSISË<br>Партыя справядлівасці | 4 504 | 0,57% (1) |
| AAK – ALEANCA PËR ARDHMËRINË E KOSOVËS<br>Альянс за будучыню Косава | 61 688 | 7,83% (8) |
| PSHDK – PARTIA SHQIPTARE DEMOKRISTIANE E KOSOVËS<br>Албанская Хрысціянска-дэмакратычная партыя Косава | 7 701 | 0,98% (1) |
| PRK – PARTIA REPUBLIKANE E KOSOVËS<br>Рэспубліканская партыя Косава | 643 | 0,08% (0) |
| PLK – PARTIA LIBERALE E KOSOVËS<br>Лібіральная партыя Косава | 3 600 | 0,46% (0) |
| VTN – VATAN<br>Кааліцыя "Ватан" | 9 030 | 1,15% (4) |
| BSDAK – BOЉNJACKA STRANKA DEMOKRATSKE AKCIJE KOSOVA<br>Баснійская партыя дэмакратычнага дзеяння Косава | 2 906 | 0,37% (1) |
| KDTP – KOSOVA DEMOKRATIK TЬRK PARTISI<br>Турэцкая дэмакратычная партыя Косава | 7 879 | 1,00% (3) |

[1] Значная частка лінгвістычных і геграфічных выданняў падаюць назву сэрбска-харватскае мовы, аднак, нягледзячы на значную блізкаць сучасная палітычная сітуацыя не выкарыстоўвае гэтых тэрмінаў. Афіцыйна назва гэтае мовы якая выкарыстоўваецца у Косава – сэрбская, больш за тое баснійчы якія выкарыстоўваюць фактычна тую ж мову, кажуцьпра Bosnic language. Як гарасаваць лісты.

[2] Палітычнымі суб'ектамі (political entity) у выбарчам заканадаўстве Косава называюцца арганізацыі і незалежныя кандыдаты, якія маюць права удзельнічаць у выбарах і ўнесены ў выбарчы бюлетэнь.

[3] Назвы партыяў надалей падаюцца ў арыгінальным скарачэнні. Назвы партыяў на мове арыгіналу, а таксама іх беларускі пераклад можна паглядзець у табліцы з вынікамі галасавання.

[4] Дэмакратызацыя дапамагае вырашэнню, «рухае наперад» албанскае пытанне *(англ)*.

[5] Такая з'ява шырока распаўсюджана ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Эўропы. Напрыклад у заходніх рэгіёнах Украіны сацыялагічныя даследванні звычайна выяўляюць устойлівую падтрымку рынакавых адносінаў, лібералізацыі эканомікі і г.д. (гэта успрымаецца як частка эўрапескае ідэнтычнасці) але у сацыяльных практыках насельніцтва выяўляе арыентацыю на дапамогу дзяржавы, сацыяльную абарону, жорсткае рэгуляванне.

[6] Праграмы партыяў досыць часта утрымліваюць словазлучэнні кшталту: «інтэграыя ў Заходнюю цывілізацыю», «заходні свет», празаходняя ці пра-эўрапейская арыентацыя і г.д.

[7] Ісламская ідэнтычнасці і рэлігійная свядомасць значна больш слабая, чым у славян-мусульман, у Босніі выкарыстанне ісламскае сымболікі пад час выбараў звычайная з'ява.

[8] У якасці палітычных суб'ектаў выступалі партыі, грамадскія ініцыятывы, грмамадскія ад'яднанні і іх кааліцыіі, а так сама незалежны кандыдаты.

[9] Палітычныя суб'екты падаюцца ў такім парадку, як яны былі пазначаны ў выбарчых белютэнях.

[10] У Беларускай Энцыклапедыі т. 8 Мн. 1999г. ст. 426 назва LDK перакладзена на беларускую мову як «Дэмакратычны саюз Косава».